# На тым тыдні...

## Ратуемся спадчынай

✓На сцэне Вішоўскага СЦК і ВЧ Бялыніцкага раёна ў рамках раённага тэатральнага праекта адбылася прэм'ера народнай камедыі паводле п'есы Васіля Ткачова **«Без Ягора будзе гора»**. Рэжысёр пастаноўкі Валянціна Паўловіч. Нягледзячы на неспрыяльную эпідэміялагічную сітуацыю, праект прадоўжыў існаванне ў анлайн-фармаце, але вішоўскія аматары «жывога» выканальніцкага мастацтва атрымалі асалоду ад ігры самадзейных акцёраў.

Сюжэт пастаноўкі просты: у вёсцы Шкірдзюкі, некалі шумнай і вясёлай, засталіся дажываць свой век толькі трое пенсіянераў: дзве жанчыны і мужчына – дзед Ягор (Уладзімір Чужаўка), які часта дапамагае суседкам. Аднойчы прапануе суседцы-ўдаве Наталлі Паўлаўне (Валянціна Паўловіч) не толькі дапамогу ў набыцці дроваў на зіму, але і сэрца. Жанчына 40 гадоў працавала настаўніцай у мясцовай школе, на яе вачах апусцела вёска, закрылася школа. Аднойчы ў жанчыны скончыліся дровы, а старшыня сельсавета прапанаваў разбурыць сцены школы, парэзаць на чуркі і імі паліць у печы... Жаданне Ягора і Наталлі Паўлаўны жыць разам непакоіць яшчэ адну гераіню п'есы – Лізавету Акрошку (Валянціна Сельвянкова), якая праз усё жыццё пранесла цёплыя пачуцці да Ягора. Любоўны «трохкутнік», сама таго не ведаючы, умацоўвае дачка Ягора – Анька (Алена Хартава), якая хоча забраць бацьку з сабой у горад. Навіна вельмі палохае жанчын: на Ягоры трымаецца іх няхітрая гаспадарка і ўвогуле ўся вёска. Заканчваецца пастаноўка візітам паштальёнкі (Наталля Герчук), якая прыносіць жанчынам тэлеграмы: у Акрошкі знайшоўся сын, ад якога не было доўгі час ніякіх звестак, а Паўлаўне прыслалі віншаванні былыя вучні, якія не забылі любімую настаўніцу.

✓У аграгарадку Макараўцы ў Бераставіцкім раёне **10 студзеня** супрацоўнікі мясцовай культасвет установы і аматары традыцыйнай культуры правялі абрад калядавання **«Каляднае падарожжа»**. Калядніці парадавалі жыхароў паселішча жартамі, байкамі, і традыцыйнымі каляднымі спевамі. Людзі старэйшага веку з радасцю адзначалі, што лічыцца добраю прыкметай, калі дом наведвае Каляда з Казою. Усе гаспадары шчодра частавалі каляднікаў.

✓**11 студзеня** ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» прайшло адкрыццё выставы-конкурсу дзіцячай творчасці **«Зимние впечатления»**. У экспазіцыю ўвайшлі працы навучэнцаў мастацкіх школаў Мінска. Удзельнікам было прапанавана выказаць свае пачуцці да зімовага часу з дапамогаю жывапісу, графікі, скульптуры і дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва. Мэта выставы – удасканаленне духоўна-маральнага выхавання і фармаванне творчай асобы, падтрымка таленавітых дзяцей. Працы ўдзельнікаў ацэніць журы (прафесійныя мастакі, мастацтвазнаўцы, выкладчыкі выяўленчага мастацтва), пераможцы і прызёры атрымаюць дыпломы і запрашэнне на ўрачыстае ўзнагароджанне. Па выніках конкурсу будзе падрыхтаваны электронны каталог усіх твораў выставы.

Пабачыць зімовыя ўражанні дзяцей і моладзі можна да 30 студзеня.

✓Выстава працаў **«Калядныя ўзоры»** майстроў і мастакоў народнага клуба «Ля возера» сёлета ў Браславе адкрылася 25-ы раз. Умовы не дазволілі сабраць на ўрачыстае адкрыццё экспазіцыі шмат браслаўчанаў, але ў краязнаўчым музеі паклапаціліся і зрабілі анлайн-трансляцыю. Гэтым разам выстава праходзіць пад назвай «Зімовы настрой», што адчуваецца ў многіх вырабах. Цэнтральную частку займае бела-блакітнае пано Марыны Марозавай, якая нядаўна асвоіла ткацтва, сярод новых імёнаў таксама Галіна Бурко, якая прадставіла аўтарскія навагоднія цацкі з ваты. Уражваюць фігуркі Галіны Сплашновай з воўны і палімернай гліны. З'явіўся ў горадзе і яшчэ адзін майстар, які працуе са скурай, – Аляксандр Бацюк, ён пераехаў з Барысава і адразу пасябраваў з клубам «Ля возера». Далучыліся і дзеці, якія займаюцца ў студыі **«Акварэлька»** пад кіраўніцтвам Галіны Ставіцкай.

– Прадстаўленыя творы 37-і майстроў, напрыклад, пяшчотныя акварэлі Аліны Трукан, лялькі Вольгі Лысёнак, кераміка Валерыя Зінкевіча, цацкі Марыны Корсак, жывапіс Зоі Кальцовай, карціны Галіны Ставіцкай... – адзначыла кіраўнік клуба Наталля Парахневіч. – Пад час адкрыцця мы правялі галасаванне на найлепшага анёлка ручной работы, якімі ўпрыгожаная наша ялінка: перамагла Ганна Жылевіч, адзначаныя таксама Марыя Дворская і Валянціна Архіпенка.

Выстава «Калядныя ўзоры» будзе працаваць да канца студзеня.



*Скарыстаная інфармацыя з паведамленняў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» (Мінск), сайтаў газет «Зара над Друццю» (Бялынічы), «Браслаўская Звязда», «Бераставіцкая газета».*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ